Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

Кафедра немецкой филологии и лингводидактики

# Язык и знание

Материалы VIII межвузовского научного семинара «Язык и знание»
Брест, 08 июня 2022

Брест 2022

Язык и знание: материалы VIII межвузовского научного семинара «Язык и знание», Брест, 08 июня 2022 г. / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина; отв. редактор Т. А. Кальчук. – Брест : БрГУ имени А. С. Пушкина, 2022. – 63 с.

В сборник вошли материалы VIII межвузовского научного семинара «Язык и знание», который проходил 08 июня 2022 года на базе факультета иностранных языков Учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина».

Сборник включает материалы докладов, заслушанных на семинаре.

Ответственность за содержание и стиль публикуемых материалов несут авторы.

варьированием форм существования языка и варьированием языковых единиц.

Многоаспектность изучения вариантных образований привела к формированию так называемой вариативной лингвистики, или вариалогии, которая по своим задачам шире учения тождества слова.

Необходимо подчеркнуть, что, несмотря на явные успехи в развитии вариалогии вообще и вариантологии в частности, многие онтологические вопросы явления варьирования слова остаются либо не решёнными, либо неоднозначно трактуемыми в специальной литературе. К таким вопросам относятся, например, вопросы о границах слова, типах и видах вариантности слова, и их наименовании.

При широкой трактовке явления вариативности, которая имеет место и в историческом, и современном языкознании, критерии определения границ тождественных образований часто становятся расплывчатыми, теряется специфика переменных единиц разных уровней языка. При узкой трактовке для большинства исследований на материале немецкого языка характерна неполнота описания: изучаются отдельные типы, виды или группы формальных вариантов слова, некоторые части речи. Кроме того, рассмотрение исследователями лишь вариантной пары, а не всей амплитуды внешнего колебания слова ведёт к «усечённому» представлению об этом феномене языка. Как правило, формальное варьирование слова рассматривается в отрыве от лексико-семантического варьирования слова.

Многие предложенные в специальной литературе типологии вариантных образований носят умозрительный характер, не учитывающий реальный языковой материал. Для преодоления перечисленных недостатков необходима прежде всего полная инвентаризация вариантной лексики указанного языка на базе современных источников.

**І.В. ПОЎХ**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## МІФІЧНАЯ ПРАСТОРА І ЧАС У ПАЭЗІІ НУАЛЫ НІ ГОНАЛЬ

Канцэптасфера прасторы і часу як універсальная матрыца светабачання, знаходзіць увасабленне ў розных жанрах мастацкай творчасці. Успрыманне рэчаіснасці немагчымае без змяшчэння яе ў пэўнай прасторава-часавай парадыгме: нішто на свеце не мае выйсці за яе межы. У міфічным светаўспрыманні прастора і час існуюць не як абстрактная абалонка, адасобленая ад зместу, а як таямнічыя сілы, якія вызначаюць ход усіх падзей і лёсы ўсіх істот і рэчаў – як зямных, так і тагасветных [1].

У той час як у навуковай думцы – па меншай меры, у Еўклідавай геаметрыі – прастора і час уяўляюцца гамагеннымі і бясконцымі, міфалогія размяжоўвае “сакральнае” і “прафаннае”, “цэнтр” і “перыферыю”, ствараючы своеасаблівы рытмічны малюнак, у якім чаргуюцца святочныя і звычайныя дні. Часавая дынаміка, адпаведна, мае не аднанакіраваны лінейны характар, а набывае сэнс выключна праз чаргаванне перыядаў [2].

Міфічны свет і істоты, якія яго насяляюць, – адзін з лейтматываў творчасці сучаснай ірландскай паэткі Нуалы Ні Гональ (*Nuala Ní Dhomhnaill*). Прастора і час выступаюць вызначальнымі чыннікамі гэтага свету, часам адзінымі. Так, у вершы *Táimid Damanta, a Dheirféaracha* (“Мы асуджаныя, сёстры”) тагасветнасць істот, што вядуць гутарку паміж сабой, вынікае з часу (*ноч*) і прасторы (*вада*), на фоне якіх гучыць маналог адной з іх. Кожнае з адзначаных семантычных палёў (*ноч і вада*) прадстаўлена ў творы корпусам лексічных адзінак (*ноч – зоркі; вада – узбярэжжа, прыплыў, мокры пясок*). Цікавасць уяўляе таксама супастаўленне нізкай (“прафаннай”) і высокай (“сакральнай”) прастор, увасобленых у топасах вады і нябёсаў адпаведна, апошні з якіх прадстаўлены лексічнымі адзінкамі *bánta Párthais* / *палі Эдэма* і *na Flaithis in airde / высокія Нябёсы*. Падобнае супастаўленне назіраецца і на тэмпаральным узроўні: ноч як цёмны час і канец дня выступае ў апазіцыі да вясны (*ar ghaotha fiala an Earraigh* – прыемны вясновы ветрык) [4, с. 14].

У вершы *Geasa* / “Забароны” вада як прастора, населеная міфічнымі істотамі, супрацьпастаўляецца зямлі як прасторы людзей. Першая з іх прадстаўлена лексічнымі адзінкамі *abhainn* / *рэчка, bád* / *човен*, тады як другая складаецца з лексем *tearmann* / *прытулак*, *droichead* / *мост, port / бераг*. Як і ў вершы *Táimid Damanta, a Dheirféaracha*, адзінства прасторава-часавай парадыгмы ствараецца супрацьпастаўленнем ночы (загадкавая жанчына плыве на начным чоўне) і раніцы / дня (*maidin* / *ló*). Няўстойлівасць, ненадзейнасць, хісткасць міфічнай прасторы ўвасабляе не толькі вада як адзін з яе вызначальных топасаў, але і іншыя асяроддзі, якія маюць вадкі характар альбо па сваіх уласцівасцях набліжаюцца да вады (багна, пясок), а таксама падзеі, у выніку якіх асяроддзе “прыўлашчвае” чалавека (чалавек правальваецца ў сон, падае ў пячору, тоне ў вадзе / багне, яго зацягвае ў пясок). Варта адзначыць, што сон як міфічная прастора, з якой чалавек абавязкова вяртаецца ў прастору рэчаіснасці (абуджаецца), прысутнічае ў шэрагу вершаў паэткі (*Gaineamh Shúraic* / “Зыбкі пясок”, *Mandala* / “Мандала” і інш.).

Сакралізацыя воднай прасторы адбываецца таксама праз алюзіі на біблейскія сюжэты. Яскравым прыкладам гэтага выступае верш *Ceist na Teangan* (“Моўнае пытанне”) [3], у аснову якога пакладзена паданне пра Майсея.

Тагасветныя топасы прысутнічаюць і ў шэрагу іншых вершаў паэткі. Так, у вершы *Mise an Fia* (“Я – алень”) заяц хаваецца ў кургане эльфаў (*liosachán*). Варта адзначыць, што падзеі, апісаныя ў вершы, адбываюцца ў святочны дзень, *Lae Bealtaine*, першы панядзелак траўня, які з паганскіх часоў сімвалізуе афіцыйны пачатак лета. Як сцвярджае ірландская міфалогія, дні афіцыйнага пачатку кожнай пары года – гэта час актывізацыі тагасветных істот, што знаходзіць сваё адлюстраванне і ў вершы. У вершы *Fuadach* (“Выкраданне”), як і ў *Táimid Damanta, a Dheirféaracha*, назіраецца супастаўленне рэальнай і міфічнай прастор, увасобленых у топасах дома і поля адпаведна. Лексічны корпус хатняй прасторы складае пералічэнне хатніх абавязкаў, якія выконвае чараўніца замест жанчыны (засцілае ложкі, мые посуд, кладзе вопратку ў пральную машыну). Рэальная і міфічная прасторы супрацьпастаўляюцца на ўзроўні семантычных палёў “цеплыня” (*агонь*) і “холад” (*бясконцая цемра, змерзла ад холаду*) адпаведна. Паказальна таксама, што пазбыцца злоснай чараўніцы як прадстаўніцы “халоднай” прасторы чалавек можа таксама праз уздзеянне на яе гарачым прадметам (*dóigh is loisc)* [4, с. 60]).

Адметным аб’ектам тагасветнай прасторы ў паэзіі Нуалы Ні Гональ выступае дрэва. Фея прыходзіць у госці да жанчыны без запрашэння і сячэ яе дрэва, якое, аднак, з часам аджывае (*An Crann* / “Дрэва”). Значную ролю ў стварэнні міфічнай прасторы мастацкага твора выконваюць таксама сакральныя локусы (*teampall Chaitlíona* / храм Катлёны, *Cuas na Míol* / заліў Міл, *Móin Mhór* / поле Моін Во, на якім у 1151 годзе адбылася славутая сеча паміж ірландскімі каралеўствамі Лейнстэр і Томанд, *Fionntrá* / вёска Фіонтра, мясцовасць *Brú na Bóinne*, дзе дагэтуль захаваліся курганы, могілкі і іншыя гістарычныя аб’екты эпохі неаліту, *Teach Da Deirge* / “чырвоны дом” і шэраг іншых).

Царква і царкоўны двор утвараюць сакральную прастору верша *Turas Chaitlíona* (“Вандроўка Катлёны”). У вершы згадваецца павер’е, згодна з якім, каб пазбыцца зубнога болю, трэба адшукаць на царкоўных могілках чэрап, узяць з яго зуб і пакласці ў кішэню. Такім чынам, сакральная прастора надае магічныя ўласцівасці аб’ектам, якія да яе належаць ці паходзяць з яе. Анафарычны паўтор злучніка і (*is*) набліжае страфу, у якой прыведзена павер’е, да фальклорных тэкстаў, што таксама выступае адным са сродкаў стварэння міфічнай прасторы.

Цікавасць уяўляе супрацьпастаўленне сакральнай і прафаннай прастор праз вобразы істот, якія іх насяляюць. Так, у вершы *Ann Ollmháthair Mhór* (“Вялікая маці”) нікчэмнасць людзей перадаецца праз корпус лексем з памяншальнай і зніжальнай канатацыяй (*aingil an uabhair / палыя анёлы, abhaic / гномы, leanaí loitithe / разбэшчаныя дзеці, ainmhithe / жывёлы*). Веліч сакральнай прасторы, у сваю чаргу, увасабляецца ў вобразе Вялікай

маці, створаным лексічнымі адзінкамі семантычнай групы “бязмежжа” (*a bhuama adamhaigh* / *атамная бомба*, *craosach* / *ненаедны*, *spéire* / *неба* і інш.).

Як адзначалася вышэй, размежаванне міфічнай і рэальнай прастор ажыццяўляецца не толькі на ўзроўні аб’ектаў і асяроддзяў, але і праз супастаўленне “сон – ява”. У вершы *An Ribe Ruainnі* (“Пасма валасоў”) прынцэса сніць сябе ў тагасветнасці, але, абудзіўшыся, вяртаецца ў прастору рэчаіснасці. Сімвалам непадзельнага адзінства дзвюх прастор выступае пярсцёнак з валасоў, які ў сне надзявае дзяўчыне на палец гном і які яна бачыць, калі прачынаецца. У вершы *An Mhaighdean Mhara* (“Русалка”) такім паяднальным чыннікам становіцца прыплыў, які, апрача непасрэднага фізічнага напластавання прафаннай (зямля) і сакральнай (вада) прастор, мае ўласны рытмічны цыкл, тым самым увасабляючы прасторавыя трансфармацыі ў часе і ствараючы цэласную прасторава-часавую парадыгму. Адзначаны рытмічны цыкл прыплываў адлюстроўваецца ў вершы з дапамогай сінтаксічных (дакладны і варыятыўны паўтор спалучэнняў *tuille agus trá, síos is síos*) і фанетычных (алітэрацыя ў прыведзеных вышэй спалучэннях, асананс ***a**gus* – ***a**ris*) сродкаў мастацкай выразнасці.

Такім чынам, праведзены аналіз дазваляе вызначыць шэраг шляхоў стварэння міфічнай прасторы і часу ў творчасці Нуалы Ні Гональ. У якасці міфічнай прасторы найчасцей выступае вада, якая сімвалізуе яе няўстойлівасць, ненадзейнасць, хісткасць і супрацьпастаўляецца цвёрдай і надзейнай “зямной” прасторы людзей. Сярод іншых топасаў тагасветнасці вылучаюцца сон, курган, поле, царква. Размежаванне прастор ажыццяўляецца на трох асноўных ўзроўнях: асяроддзе, істоты, якія яго насяляюць, і аб’екты, якія да яго належаць ці паходзяць з яго. Размежаванне міфічнага і зямнога часу адбываецца праз антанімічныя пары лексічных адзінак, якія належаць да семантычных груп “пачатак – канец” і “святло – цемра”.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Cassirer, E. An Essay on Man: An Introduction to a Philosophy of Human Culture / E. Cassirer. – New Haven : Yale University Press, 2021. – 256 p.

2. Cassirer, E. The Philosophy of Symbolic Forms. Vol. 2: Mythical Thought / E. Cassirer. – New Haven : Yale University Press, 1955. – 340 p.

3. Ní Dhomhnaill, N. Pharaoh's Daughter / N. Ní Dhomhnaill. – Winston-Salem : Wake Forest University Press, 1993. – 159 p.

4. Ní Dhomhnaill, N. Selected Poems : Rogha Dánta / N. Ní Dhomhnaill. – Dublin : New Island Books, 1993. – 159 p.